Источник: "Настаўніцкая газета" - 2012-04-14

Навука

# Па індэксе ведаў Беларусь апярэдзіла ўсе дзяржавы СНД, акрамя Расіі

***Беларусь у міжнародным рэйтынгу па індэксе ведаў паднялася на 45 месца, паведаміў на пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў старшыня Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Анатоль Русецкі.***

Згодна з ацэнкамі Сусветнага банка, па індэксе ведаў у рэйтынгу Беларусь паднялася на 45 месца, у 2009 годзе рэспубліка займала 52 месца. "Наша краіна па індэксе ведаў, а гэта значыць, па здольнасці генерыраваць, успрымаць і распаўсюджваць навуковыя веды, апярэджвае ўсе краіны СНД, акрамя Расіі", — адзначыў Анатоль Русецкі.

Па індэксе эканомікі ведаў (наяўнасць у краіне ўмоў для эфектыўнага выкарыстання навуковых ведаў у мэтах эканамічнага развіцця) Беларусь паднялася на 59 месца (у 2009 годзе было 73). Па гэтым паказчыку Беларусь сярод краін СНД уступае толькі Расіі і Украіне. Гэтыя ацэнкі пацвярджаюць, што ў цэлым навуковая сфера Беларусі функцыянуе нядрэнна і развіваецца дынамічна.

Разам з тым ёсць праблемы ў навуковай сферы, падкрэсліў Анатоль Русецкі. "Перш за ўсё — гэта навукаёмістасць ВУП, — канстатаваў ён. — На жаль, затраты на даследаванні і распрацоўкі ў нас ніжэйшыя за парогавае значэнне, якое закладзена канцэпцыяй нацыянальнай бяспекі. Пры гэтым з бюджэту мы фінансуем 0,28 працэнта, астатняе ажыццяўляецца за кошт уласных і прыцягнутых крыніц". Гэтай лічбы недастаткова.

У сваю чаргу першы намеснік прэм'ер-міністра Уладзімір Сямашка адзначыў, што Беларусь павінна ўдзяляць развіццю навукі прыярытэтнае значэнне ва ўмовах адсутнасці багатых запасаў мінеральна-сыравінных рэсурсаў. Інтэлектуальны патэнцыял, інавацыі і распрацоўкі здольны вывесці краіну на новы ўзровень развіцця. Разам з тым для павышэння эфектыўнасці навуковай сферы трэба дэталёва прааналізаваць ролю ў навукова-тэхнічнай галіне ўсіх навуковых інстытутаў і лабараторый. "Трэба вызначыць, хто ў ходзе аптымізацыі павінен застацца працаваць. Паралельна мы павінны падняць узровень аплаты і прэстыжу вучонага. Застацца павінны тыя, хто гатоў працаваць і даваць аддачу, — сказаў Уладзімір Сямашка. — Менавіта прафесійныя кадры могуць максімальна і эфектыўна інтэграваць акадэмічную, галіновую і навуку ВНУ, умацаваць яе сувязь з вытворчасцю."

"Настаўніцкая газета". Па індэксе ведаў Беларусь апярэдзіла ўсе дзяржавы СНД, акрамя Расіі